## ДА ЧЫТАЧА

Шаноўны чытач! Чарговая кніга серыі гісторыка-дакументальных хронік Памяці, якія выдаюцца ў Рэспубліцы Беларусь, прысвечана гораду Мазыру і Мазырскаму раёну — іх далёкаму і нядаўняму мінуламу. Хочацца верыць, што і вам перадасца тое глыбокае хваляванне, якое зведалі шматлікія аўтары кнігі: археолагі, гісторыкі, краязнаўцы, журналісты... Бо сапраўды — якое невычэрпна багатае мінулае ў гэтай шматпакутнай і гераічнай надпрыпяцкай зямлі, як шчодра паліта яна крывёю і потам нашых продкаў! Безліч разоў падымалася Мазыршчына на змаганне з варожым нашэсцем, і цяпер ужо ніхто не зможа назваць пайменна ўсіх, хто ў даўнія часы бараніў родную зямлю ад лютай навалы. А калі час не такі даўні? Многія старонкі ў кнізе займае бясконцы спіс воінаў, партызан, падпольшчыкаў і мірных жыхароў, што загінулі на Мазыршчыне пад час самай страшнай у гісторыі чалавецтва вайны — другой сусветнай, якая для нашага народа стала Вялікай Айчыннай. Гэты, як і другі спіс — тых нашых землякоў, хто прыняў геройскую смерць або прапаў без вестак далёка ад роднага дому,— самы запамінальны ўрок патрыятызму, урок усім нам, як трэба любіць, шанаваць і берагчы ў грозны час сваю Бацькаўшчыну.

Напэўна, спіс герояў і ахвяр вайны ў кнізе яшчэ не поўны — пошукі будуць працягвацца; рана падводзіць рысу і пад трагічным спісам ахвяр масавага палітычнага тэрору 30-х гадоў, які і на Мазыршчыне пакінуў свой жудасны след; гэтак жа і ў самім змесце кнігі нешта запатрабуе ўдакладнення,— што ж, «прыйдзе новы — а мудры — гісторык»,— наступныя выданні кнігі будуць больш поўныя і дасканалыя. Пакуль жа хочацца спадзявацца, што і ў цяперашнім яе выглядзе кніга Памяці дапаможа вам, шаноўны чытач, прасякнуцца пачуццём глыбокай удзячнасці мінулым пакаленням, бо, нягледзячы на іхнія часам трагічныя заблуджэнні і памылкі, якія ў многім абумовілі і драматызм сённяшняга нашага жыцця, яны здзейснілі для сваіх нашчадкаў галоўнае — зберaглі і перадалі нам у спадчыну самае дарагое на свеце — цудоўную, непаўторна прыгожую палескую зямлю, імя якой Мазыршчына.

144996

2 Зак. 914

Мозырская
городская ЦБС




**МАЗЫР** – горад абласнога падпарадкавання, цэнтр Мазырскага раёна Гомельскай вобласці. Размешчаны на маляўнічай узгорыстай мясцовасці ў межах Мазырскай грады. За 133 км на паўднёвы захад ад Гомеля, 5 км ад чыгуначнай станцыі Мазыр. Буйнейшы ў Беларусі порт (Пхоў) на р. Прыпяць. Насельніцтва на 1.1.1996 г. – 107,7 тыс.

З 1924 г. – цэнтр раёна (у 1926 – 1927 гг. – горад у Слабадскім раёне), у 1924 – 1930 гг. і 1935 – 1938 гг. – цэнтр Мазырскай акругі, у 1938 – 1954 гг. – цэнтр Палескай вобласці. З 1954 г. у Гомельскай вобласці.

Плошча – 3674 га. У межах горада працякае рака Прыпяць. Архітэктурна-планіровачная сістэма горада абумоўлена складаным рэльефам (р. Прыпяць, мноства яроў з розніцай адзнак вышыні 25 – 30 м). Галоўная вуліца – Ленінская, на якой размешчаны цэнтральны пляц. Адсюль пачынаецца паркавая зона. Новы раён жыллёвай забудовы – верхняе плато, якое прылягае да Оўручскай шашы.

Прамысловасць: машынабудаўнічая і металаапрацоўчая, дрэваапрацоўчая, лёгкая, харчовая, нафтаперапрацоўчая і іншыя. Буйнейшыя прадпрыемствы: нафтаперапрацоўчы завод, завод меліярацыйных машын, «Мазыркабель», завод кармавых дрожджэй, «Мазырсельмаш» і аўтарамонтны завод, вытворчае дрэваапрацоўчае і мэблевае аб'яднанні, трыкатажная і мастацкіх вырабаў, швейная фабрыкі, малочны, піваварны і хлебапякарны заводы, леспрамгас, солевыварачны камбінат. Непадалёку ад Мазыра адкрыта вялікае радовішча каменнай солі, праходзіць нафтаправод «Дружба».

Мазыр – гэта і культурны цэнтр Палесся. Да паслуг жыхароў Мазыршчыны драматычны тэатр імя Івана Мележа (раней эксперыментальны тэатр «Верасень», а яшчэ раней народны тэатр), 12 палацаў, дамоў культуры і клубаў, больш за 50 бібліятэк, тры кінатэатры, педінстытут, палітэхнікум, музычнае, медыцынскае і 4 тэхнічныя вучылішчы, 4 музычныя школы, дзіцячая мастацкая школа; 11 калектываў мастацкай самадзейнасці маюць званне «народны». Да паслуг насельніцтва Мазырскі краязнаўчы музей, музей прыкладнога мастацтва, гарадская выставачная зала.

Каля 9 тысяч спецыялістаў з вышэйшай і 12,5 тысяч з сярэдняй адукацыяй, 90 кандыдатаў і дактароў навук працуюць на прадпрыемствах, у навучальных і іншых установах горада.

У 15 сярэдніх школах і гімназіі, дзіцячых спартыўных школах працуюць звыш 2000 настаўнікаў, у 35 дзіцячых садках 6300 выхаванцаў.

На варце здароўя працоўных Мазыра каля 400 урачоў, звыш 1200 сярэдніх медыцынскіх работнікаў, якія працуюць у бальнічных установах, дзвюх паліклініках, 10 аптэках.

Выдаецца аб'яднаная газета «Жыццё Палесся».

**МАЗЫРСКІ РАЁН** размешчаны на паўднёвым захадзе Гомельскай вобласці. Утвораны 17.7.1924 г. Плошча 1,6 тыс. кв. км. Горад абласнога падпарадкавання Мазыр — цэнтр раёна. 93 сельскія населеныя пункты, 10 сельскіх Саветаў: Асавецкі, Барбароўскі, Каменкаўскі, Козенскі, Крынічанскі, Махнавіцкі, Міхалкаўскі, Прудкоўскі, Скрыгалаўскі, Слабадскі. Насельніцтва на 1.1.1996 г.— 22 600 чалавек.

Паверхня раёна—узгорыста-раўнінная, на правабярэжжы ніжняй Прыпяці з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход больш як на 30 кіламетраў працягнулася Мазырская града шырынёй 3—10 км. 77 % тэрыторыі знаходзіцца вышэй 150 м над узроўнем мора (каля 20 % вышэй 170 м). Найвышэйшы пункт — 220 м на ўсходзе раёна (паміж Мазыром і в. Бабраняты).

Карысныя выкапні: Мазырскае радовішча каменнай солі: прамысловыя запасы каля 600 млн. т, перспектыўныя 24 млрд. т, 11 радовішчаў торфу з агульнымі запасамі 4,1 млн. т (найбольшае ў раёне в. Майсееўка), 11 радовішчаў пяску з агульнымі запасамі 30,1 млн. куб. м (найбольшыя Барыскавіцкае, Козенскае, Бярозаўскае, Васькаўскае), радовішчы глін і суглінкаў — Лешня, Махнавічы, Ляскі.

Сярэдняя тэмпература студзеня —6,4°, ліпеня + 18,8 °С. Ападкаў 600 мм за год. Вегетацыйны перыяд 199 сутак. Рэкі — Прыпяць з прытокамі Трэмля, Іпа, Ненач, Тур, Мытва, Скалодзінка; Чэрцень (прыток Славечны). Даўжыня меліярацыйнай сеткі 1,7 тыс. км. Глебы дзярнова-падзолістыя — 48,2 %, дзярнова-падзолістыя забалочаныя — 18 %, поймавыя — 22,4 %, тарфяна-балотныя — 7,2 %.

Сельгасугоддзі складаюць 44 708 га, або 27,8 % плошчы раёна, у т. л. ворыва 26 337 га (16,4 %), сенажаці і пашы 16 344 га (10,1 %). Асноўныя землекарыстальнікі — 13 калгасаў і 8 саўгасаў. Пад лесам 52,4 % плошчы, найбольшыя лясныя масівы на захадзе раёна. Пераважае хвоя, з ліcцевых — бяроза, вольха, дуб. 18 % лясоў — штучныя насаджэнні.

Па тэрыторыі раёна праходзяць чыгунка Калінкавічы — Оўруч, аўтамабільныя дарогі Мазыр — Оўруч, Мазыр — Нароўля, Мазыр — Лельчыцы, Мазыр — Петрыкаў. Суднаходства на Прыпяці.

У раёне 11 сярэдніх, 9 базавых, 6 пачатковых школ, у якіх у 1995—1996 гг. навучалася 3477 чалавек, працавала 487 настаўнікаў, 21 дашкольная дзіцячая ўстанова, дзе выхоўвалася 813 дзяцей. У вёсках раёна дзейнічаюць 33 масавыя бібліятэкі, 36 клубных устаноў, 22 кінаўстаноўкі, 3 музычныя школы, 4 бальніцы, 31 фельчарска-акушэрскі пункт, 5 амбулаторый і аптэк, 11 комплексных прыёмных пунктаў і вытворчых участкаў бытавога абслугоўвання насельніцтва, у в. Гурыны — філіял Беларускага дзяржаўнага мастацкага музея.

На тэрыторыі раёна 58 помнікаў, абеліскаў і мемарыяльных дошак па гісторыі і культуры раёна, больш за 30 помнікаў археалогіі, архітэктуры, прыроды і сядзібна-паркавага мастацтва.

Пасля катастрофы на Чарнобыльскай АЭС для перасяленцаў з зоны жорсткага радыяцыйнага кантролю пабудавана 8 пасёлкаў.

На Мазыршчыне




ФРАГМЕНТ КАРТЫ МІНСКАЙ ГУБЕРНІ. КАНЕЦ XVII — пачатак XVIII ст. ст.
Коленовичи
Рудня
Бесечка
Гулевичи
Костюковичи
Слинка
Загораны
Петриковъ
Богранова
Скрыгалов
Изногорской
Мозыръ
Туръ
Прудокъ
Моосевка
Цасчерскис
Былавск
Лешня
Барисковичи
Сидельники
Слобода
Раенка
Слабовъ
Глиница
Стрельскъ
Юровичи
Юровичи
Осовецъ
Казимировка
М. Зимовище
Осовецъ
Березовъ
Василькова
р. Уборть
Остроржанка
Пенка Чожъ
Бибики
Бабичъ
Мелешковичи
Березовка
Буйкавичи
Буховщина
Дуброва
Махалки
р. Припять
Кусчовица
Махновичи
М. Боковъ
Наровля
Ремезы
Ельскъ-Королин Чожъ
Пусъошка